ле З.Бядулі (1961), «Марынка-крапіўніца» А.Вольскага і П.Макаля (1962), «Ліпавічкі» паводле У.Галубка (1969), «Скажы сваё імя, салдат» А.Вярцінскага (1975), «Балада пра белую вішню» С.Клімковіч (1984). Асабліва яскрава майстэрства Л. выявілася ў спектаклях для дарослых: «Чортаў млын» паводле Я.Дрды, «Цудоўная Галатэя» Б.Гадара і С.Дарваша (абодва 1968), «Боская камедыя» І.Штока (1971), «Клоп» У.Маякоўскага (1975), «Ляўша» паводле М.Ляскова (1978), «Прыгоды бравага салдата Швейка» паводле Я.Гашака (1981), «Сымон-музыка» паводле Я.Коласа (1982), «Жаваранак» Ж.Ануя (1984). Аўтар кніг «Лялечны тэатр у школе» (1967), «Тэатр лялек» (1974).

*Літ.*: К а л а д з і н с к і М. Усё пачынаецца з казкі // Тэатр. Мінск. 1983. №2; Я г о ж. Творчай сталасці далягляды // Мастацтва Беларусі. 1983. №3.



*Л.П.***Ляз.**

«**ЛЯНО́К**», старадаўні карагод. Музычны памер двухдольны. Тэмп ад павольнага да ўмерана хуткага. Належыць да групы карагодаў, якія адлюстроўваюць працоўную дзейнасць чалавека. Удзельнікі карагода суправаджалі спеў ілюстрацыйнымі, пераймальнымі рухамі — пра сяўбу, уборку, апрацоўку лёну. Асн. малюнак «Л.» — круг, у цэнтры якога салістка пачынала спяваць, а ўдзельнікі карагода падпявалі. На Магілёўшчыне спявалі:

Як пасею я лянок
Пры дарозе, пры лужку.
Ой лі, о ха-ха,
Пры дарозе, пры лужку.

(У кожным куплеце паўтараецца другі радок).

Мне сказалі, што мой лён,
Ён прыбіт і прывалён.
Як была я малада,
Танкапраліцай была...

Удзельнікі карагода хадзілі, прытупваючы, парамі па крузе. Салістка паказвала, як сеяла, прыбівала лён і інш. На Віцебшчыне карагод суправаджаўся песняй:

Ох, я сеяла, сеяла лён,
Я сеяла, прыгаварывала,
Чобатамі прыкалачывала.
Ты ўдайся, удайся, мой лён,
Ты ўдайся, мой беленькі...

У в. Куранец Вілейскага р-на зафіксаваны іншы варыянт карагода «Л.»: выканаўцы (юнакі і дзяўчаты) станавіліся ў 2 рады адзін супраць аднаго. Першымі рухі пачыналі дзяўчаты, а хлопцы падпявалі. У наступным куплеце ролі мяняліся. Танец суправаджаўся песняй:

Урадзіўся на полі наш лянок,
Наш шаўковы кужалёк.
Ах, мы сеялі, сеялі лянок.

Потым спявалі пра тое, як лянок палолі, ірвалі, малацілі, церлі, трапалі, пралі, снавалі, бялілі. І канчалі словамі песні:

Сшыла Ганна (ці любое іншае імя)
Сабе кашульку.

«Л.» вядомы па ўсёй Беларусі.

*С.В.Гуткоўская.*

«**ЛЯТУ́ЧАЯ МЫШ**», аперэта ў 3 дзеях І.Штрауса-сына. Лібрэта К.Хафнера і Р.Жэне паводле п'есы А.Мельяка і Л.Галеві «Гадзіннік з боем». Рускі тэкст М.Эрдмана і М.Вольпіна. Адзін з лепшых узораў класічнай аперэты. На бел. сцэне пастаўлена ў 1961 у Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі як камічная опера (дырыжор Т.Каламійцава, рэж. В.Броўкін, мастак Я.Чамадураў, балетмайстар А.Апанасенка, хормайстар А.Кагадзееў; Генрых Айзенштэйн — В.Бруй, В.Гур'еў; Разалінда — Л.Ганестава, Т.Шымко; Адэль — Т.Ніжнікава, Т.Пастуніна; князь Арлоўскі — С.Гулевіч, Фальк — В.Ганчарэнка, А.Саўчанка; Блінд — В.Плевіня, В.Чарнабаеў), у Магілёўскім абл. т-ры муз. камедыі ў Бабруйску ў 1966 (рэж. У.Амельчанка), у Дзярж. т-ры муз. камедыі Беларусі ў 1981 (гэтым спектаклем тэатр пачаў работу ў новым будынку; дырыжоры І.Абраміс, пазней А.Лапуноў, А.Сасноўскі, рэж. А.Малчанаў, мастак С.Кошкін, балетмайстар В.Бутрымовіч, хормайстры Н.Андросава і М.Шпакоўская; Генрых Айзенштэйн — В.Бажэнаў, Г.Нікіцін; Разалінда — Н.Гайда, В.Мазур, Н.Белавусава; Адэль — З.Вяржбіцкая, В.Пятліцкая, В.Міціна, Л.Лют; Альфрэд — Н.Дуднік, Г.Нікіцін; Фальк — Г.Казлоў, П.Рыдзігер, Р.Харык; Блінд — В.Барухін, Казлоў, В.Сердзюкоў; Амадэй — Ю.Харытонаў, В.Шаўкалюк; князь Арлоўскі — Н.Адамовіч, У.Лінкевіч).

*Н.А.Юўчанка.*

**ЛЯХ** Леў Палікарпавіч (н. 12.6.1937, г. Наварасійск Краснадарскага краю, Расія), дырыжор. Засл. дз. маст. Беларусі (1987). Праф. (1995). Скончыў Бел. кансерваторыю (1964, клас М.Маслава; 1971, клас В.Катаева і К.Ціханава). З 1955 хормайстар, з 1966 дырыжор опернага класа кафедры опернай падрыхтоўкі Бел. кансерваторыі (дэбютаваў у оперы «Алека» С.Рахманінава), з 1971 дырыжор творчага аб'яднання «Нац. акад. Вял. т-р оперы і балета Рэспублікі Беларусь» (дэбют — «Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава, 1971). Творчасці Л. характэрны пранікненне ў маст. канцэпцыю і сутнасць зместу твора, адчуванне яго стылістычных асаблівасцей. Пад муз. кіраўніцтвам Л. пастаўлены: оперы «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава (2-я рэд., 1992), «Фран-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ